# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА:
# АСОБА, ДЗЕЙНАСЦЬ, СПАДЧЫНА

Присодячи имъ напамет суету беду и пра

света • Понеже в розмайтыхъ речахъ лю

суету покладают мысли и кохания свои • Еди

в битвахъ и в панованиих • Друзии в богатестве



йнии

нийже

шном

цетех

мно

имат

охае

дрын

кобы

тами

книги

досконале поразумети иже царь Саломон

мыслахъ и коханиахъ людьскыхъ говорить • На

одно месте пишеть, иже несть лепшего толико

пити и чинити добро души своей • И на дру

месте пишеть, лепей есть пойти в домъ пла

ижели в домъ пированиа • Такежъ в найном ме

кажеть • Ничтоже имат злишку мудрый надъ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа

# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА

## АСОБА, ДЗЕЙНАСЦЬ, СПАДЧЫНА

*Укладальнік Аляксандр Груша*

Мінск
«Беларуская навука»
2017

УДК [655.11(476)(092)+929Скарына](082)
ББК 7610(4Беи)я43
Ф83

Р э д а к ц ы й н а я  к а л е г і я:

Л. А. Аўгуль, У. І. Васільеў, Г. Я. Галенчанка, А. І. Груша (старшыня),
А. М. Дрозд, А. А. Каваленя, Г. І. Кавальчук, І. Л. Капылоў,
І. В. Лямешкін, С. Нарбутас, А. В. Сцефановіч, А. І. Цітавец

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук, прафесар В. Ф. Голубеў,
кандыдат гістарычных навук А. Б. Доўнар

Ф83 **Францыск** Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына / Цэнтр. навук. б-ка імя Якуба Коласа Нац. акад. навук Беларусі ; уклад. Аляксандр Груша ; рэдкал.: Л. А. Аўгуль [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 295 с.
ISBN 978-985-08-2151-5.

Зборнік артыкулаў прысвечаны асобе, дзейнасці і спадчыне Францыска Скарыны – ураджэнца Полацка, доктара медыцыны, першадрукара Вялікага Княства Літоўскага, перакладчыка і выдаўца Бібліі, пісьменніка. Аўтары кнігі прадстаўляюць не толькі розныя краіны, але і розныя галіны гуманітарных ведаў, навуковыя інтарэсы, нацыянальныя і навуковыя школы, розныя падыходы ў даследаваннях. У артыкулах разгледжаны перадумовы дзейнасці Скарыны, тыпы і моўная мадэль яго перакладаў кніг Бібліі, значэнне асобных сімвалічных выяў Скарыны, месцазнаходжання яго друкарні ў Празе, паходжанне інфармацыі аб магчымай паездцы Скарыны ў Маскву, іншыя пытанні.

Разлічаны на прафесійных даследчыкаў, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца асобай, дзейнасцю і спадчынай Францыска Скарыны.

**УДК [655.11(476)(092)+929Скарына](082)**
**ББК 7610(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-2151-5**

© Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 2017
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2017

# ЗМЕСТ


Спіс скарачэнняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

*Груша Аляксандр.* Ад укладальніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

*Циценене Рима.* Традиции письменности Великого Княжества Литовского до начала XVI в.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12

*Нарбутас Сигитас.* «Бивлия Руска» и её современники – первые печатные издания Великого Княжества Литовского . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*Ковальчук Галина.* Исследования творческого наследия Ф. Скорины украинскими учёными XIX – начала XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

*Шутова Ольга.* «Уликовая» парадигма в историографии: новые возможности исследования биографии Франциска Скорины . . . . . . . . . . . . 74

*Бразгуноў Алесь.* Біблія Скарыны ў кантэксце перакладаў XVI ст.: тэксталагічны аспект . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103

*Будзько Ірына.* Лінгватэксталогія пражскіх выданняў Францыска Скарыны 121

*Темчин Сергей.* Тау-крест в треугольнике на гравюрном портрете Франциска Скорины . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146

*Лемешкин Илья.* Библия Пражская (1488) и **бивлиꙗ роуска** Франциска Скорины. Место печатания . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154

*Бондар Наталия.* Рецепция книг «Библии Руской» Ф. Скорины в украинской книжной культуре XVI–XVII стст. на примере конволюта печатных и рукописных текстов из собрания П. Н. Попова . . . . . . . . . . . . . . . 195

*Нарбутене Дайва.* Книгопечатание в Великом Княжестве Литовском после Франциска Скорины . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212

*Киреева Галина.* История одного экземпляра «Малой подорожной книжки» 223

*Глеб Марына, Крэнт Дзмітрый, Сыцько Кірыл.* Падрыхтоўка да юбілеяў беларускага кнігадрукавання ў 1925 і ў 1967 гг. (дакументы з Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231

Звесткі пра аўтараў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 295

# CONTENTS


Enumeration list . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

*Hruša Aliaksandr.* From the editor. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

*Cicėnienė Rima.* Traditions of writing in Grand Duchy of Lithuania before 16th centuries . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12

*Narbutas Sigitas.* «Ruthenian Bible» and its contemporaries – earliest printed books of the Grand Duchy of Lithuania . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*Kovalchuk Galina.* The studies on F. Skaryna`s heritage by Ukrainian scientists of 19th – the beginning of 20th century . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

*Shutova Olga.* «Clues» paradigme in historiography: new perspectives in biography studies of Francysk Skaryna. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74

*Brazgunou Alaxandr.* Skaryna's Bible in the context of translations of the 16th century: the aspect of textual criticism . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103

*Budzko Iryna.* Linguotextology of Francysk Skaryna's Prague edition . . . . . . . . . 121

*Temčinas Sergejus.* The Tau cross inscribed the triangle on the engraved portrait of Francis Skorina . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146

*Lemeškin Ilja.* Prague Bible (1488) and b of Francysk Skaryna. Printing place. . . 154

*Bondar Nataliia.* The reception of books of «Biblia Ruska» by F. Skaryna in Ukrainian book culture at the example of the convolute of printed and hand-written texts from P. N. Popov's collection . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195

*Narbutienė Daiva.* Publishing in the Grand Duchy of Lithuania after Francysk Skaryna . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212

*Kireeva Galina.* The history of one copy of the «Little Road Book» . . . . . . . . . . . 223

*Hleb Maryna, Krent Dzmitry, Sytsko Kiryl.* Preparation to the anniversaries of Belarusian printing in 1925 and 1967 (Documents from the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus and the Yakub Kolas Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus) . . . . . . . . . . . . . . . 231

Information about the authors . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 295

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

*Бібліятэкі і архівы*

БРАН. ОР – Библиотека Российской академии наук. Отдел рукописей.

НБУВ. ИР – Национальная библиотека Украины имени В. И. Вернадского. Институт рукописи (Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського. Інститут рукопису).

ЦНА НАН Беларусі – Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

ЦНБ НАН Беларусі – Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

AHMP – Archiv hlavního města Prahy (Сталічны архіў Прагі).

LMAVB. RS – Lietuvos Mokslų Akademijos Vrublevskių biblioteka. Rankraščių skyrius (Бібліятэка імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук. Аддзел рукапісаў).

MHMP – Muzeum hlavního města Prahy (Сталічны музей Прагі).

ÖNB – Österreichische Nationalbibliothek (Нацыянальная бібліятэка Аўстрыі).

УДК 002.2:394.46(476)(091)“19”(093.2)

*Марына Глеб, Дзмітрый Крэнт, Кірыл Сыцько*

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ЮБІЛЕЯЎ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ Ў 1925 І Ў 1967 гг. (ДАКУМЕНТЫ З ЦЭНТРАЛЬНАГА НАВУКОВАГА АРХІВА НАН БЕЛАРУСІ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА НАН БЕЛАРУСІ)

У дадзенай публікацыі прадстаўлены дакументы Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, звязаныя з падрыхтоўкай юбілеяў кнігадрукавання ў Беларусі ў ХХ ст. Гэтыя дакументы змяшчаюць матэрыял, які дапаможа высветліць, як фарміраваліся культурныя практыкі, звязаныя з ушанаваннем асобы Францыска Скарыны ў Беларусі, ролю Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), у далейшым – Акадэміі навук Беларусі ў арганізацыі мемарыяльных мерапрыемстваў, прысвечаных гэтаму дзеячу. Усе крыніцы публікуюцца ўпершыню.

*Ключавыя словы*: Францыск Скарына, гістарычныя крыніцы, кнігадрукаванне, Акадэмія навук Беларусі.

The article presents the documents of the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus and the Yakub Kolas Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus associated with the preparation of the anniversary of book printing in Belarus in the 20th century. The documents contain material that will help to explore the establishment of cultural practices associated with commemoration of Francysk Skaryna in Belarus, the role of the Institute of Belarusian Culture (Inbelkult) and the Academy of Sciences of Belarus in the organization of memorial events dedicated to this figure. All historical sources are published for the first time.

*Keywords*: Francysk Skaryna, historical sources, book printing, Academy of Sciences of Belarus.

## Прадмова

Сёння вобраз Францыска Скарыны з’яўляецца адным з самых значных аб’ектаў сацыяльна арганізаванай памяці ў Беларусі. Ён асэнсоўваецца і перажываецца ў сувязі з грамадскімі мэтамі і каштоўнасцямі. Памяць пра Скарыну мае свае наратывы, кананічныя тэксты, «месцы памяці», зоны ўмаўчання, культурныя формы і практыкі. Гэта памяць пераадкрываецца, перапрацоўваецца, мадэлюецца ў адпаведнасці з запытамі цяперашняга часу і планамі на будучыню [1, p. 113–114; аб вобразе Скарыны ў гістарычнай памяці гл.: [2, 3]).



pawet.net

Дадзеная публікацыя змяшчае матэрыял, які дапаможа высветліць, як фарміраваліся культурныя практыкі, звязаныя з ушанаваннем асобы Скарыны ў Беларусі, роль Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), у далейшым – Акадэміі навук Беларусі (у якую ў 1928 г. быў рэарганізаваны гэты інстытут) у арганізацыі мемарыяльных мерапрыемстваў, прысвечаных гэтаму дзеячу.

Апублікаваныя дакументы захоўваюцца ў Цэнтральным навуковым архіве НАН Беларусі і ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Яны адкладаліся ў выніку падрыхтоўкі двух юбілеяў беларускага кнігадрукавання, якія адзначаліся ў Беларусі ў 1925 і ў 1967 гг. Прадстаўлены толькі асобныя выбаркі з вялікага дакументальнага масіву, звязанага з падрыхтоўкай гэтых юбілеяў.

Дакументы аб'яднаны ў два раздзелы. У першы раздзел уключаны дакументы, якія датычаць падрыхтоўкі да 400-годдзя беларускага друку, у другі – дакументы, што складзены ў выніку падрыхтоўкі да 450-гадовага юбілею беларускага кнігадрукавання.

Першы раздзел змяшчае 20 дакументаў за 1924–1927 гг. Ён прадстаўлены пратаколамі агульных сходаў членаў Інбелкульта, пасяджэнняў Прэзідуума, Навуковай Рады Інбелкульта, гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта, перапіскай, іншымі дакументамі.

Дакументы знаёмяць з ініцыятывай стварэння Скарынінскай камісіі (Юбілейнай Скарынінскай камісіяй), якой была даручана арганізацыя святкавання 400-годдзя беларускага друку з яе персанальным складам, задачамі і іх выкананнем.

Асаблівай увагі заслугоўваюць наступныя дакументы. З дакумента № 1 можа вынікаць, што ініцыятыва шырокага святкавання 400-годдзя «са дня выхаду ў свет першай кнігі на беларускай мове (бібліі Ф. Скарыны)» зыходзіла ад члена гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта У. І. Пічэты. На адным з пасяджэнняў гэтай секцыі, у чэрвені 1924 г., ён унёс прапанову ўзняць пытанне аб святкаванні дадзенага юбілею перад Інбелкультам, стварыць камісію, якая б акрамя арганізацыі ўрачыстага пасяджэння з нагоды ўказанага юбілею ўзяла б на сябе арганізацыю выставы старадрукаваных выданняў у Дзяржаўнай бібліятэцы, занялася падрыхтоўкай выдання прац пра Францыска Скарыну. Адной з галоўных задач Юбілейнай Скарынінскай камісіі была падрыхтоўка да выдання зборніка прац, прысвечанага 400-годдзю беларускага друку. Дакументы № 10–17 праліваюць святло на бягучую працу камісіі па падрыхтоўцы ўказаннага зборніка.

З дадзенага раздзела тэматычна вылучаецца дакумент № 20 – ліст старшыні аддзела гуманітарных навук Інбелкульта Сцяпана Некрашэвіча да Ігната Дварчаніна з просьбай аб дасланні яго дысертацыі аб Францыску Скарыне з мэтай азнаямлення з яе зместам і падрыхтоўкай яе да друку, а таксама з запрашэннем прыняць удзел як аўтара ў выданні другога тома Прац аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. Публікацыя гэтага дакумента сведчыць пра спробы

Інбелкульта выпусціць у свет буйныя прафесійныя працы, прысвечаныя жыццю, дзейнасці і творчасці Скарыны.

Другі раздзел змяшчае 26 дакументаў за 1965–1968 гг. Гэта пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума, Бюро аддзялення грамадскіх навук АН БССР, Аргкамітэта па правядзенні святкавання 450-годдзя беларускага кнігадрукавання; перапіска гэтага Аргкамітэта; праект праспекта зборніка, прысвечанага гэтаму юбілею; праграма святкавання 450-годдзя беларускага кнігадрукавання; спіс асоб, запрошаных на сесію, прысвечаную юбілею АН БССР, іншыя дакументы.

Апублікаваныя дакументы дэманструюць смелыя ініцыятывы Аргкамітэта па правядзенні святкавання чарговага юбілею беларускага кнігадрукавання. Указаны аргкамітэт узначаліў вядомы беларускі паэт віцэ-прэзідэнт АН БССР Кандрат Атраховіч (Кандрат Крапіва). Наколькі высока ён ставіў заслугі Скарыны, сведчаць яго прапановы, вынесеныя на абмеркаванне Аргкамітэта. Сярод іх – аб правядзенні навуковых сесій не толькі ў АН БССР, але таксама і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, Мінскім педагагічным інстытуце і Мінскім медыцынскім інстытуце; аб устанаўленні помнікаў Скарыне не толькі ў Полацку, але і ў Мінску; аб прысваенні імя Скарыны шэрагу навучальных установ, адной з друкарняў і нават аб узняцці пытання перад Сусветным саветам міра, «каб адзначыць у сусветным маштабе Скарыну як вучонага і зачынальніка беларускага кнігадрукавання» (дакумент № 22).

У СССР у каноне успамінаў заслужаных дзеячаў мінулага іх значэнне і заслугі падкрэсліваліся, у тым ліку праз правядзенне ў цэнтральных значных месцах публічных мерапрыемстваў: сходаў, мітынгаў, сустрэч, пасяджэнняў і інш., удзел у іх высокіх афіцыйных асоб і г. д. Як можа вынікаць з апублікаваных дакументаў, канон святкавання юбілею кнігадрукавання павінен быў адпавядаць таму канону, што быў звязаны з самымі значнымі падзеямі ў гісторыі рэвалюцыйнага руху, гісторыі СССР, у тым ліку, канону святкавання Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі [1, р. 119]. Гэты канон вымагаў, у прыватнасці, правядзенне юбілейнай сесіі АН БССР, урачыстага сходу, выданне навуковай і навукова-папулярнай літаратуры па тэме юбілею. Вельмі важным быў удзел у дадзеным сходзе высокапастаўленых прадстаўнікоў партыі і кіраўніцтва рэспублікі, шырокага прадстаўніцтва працоўных і інтэлігенцыі (дакументы № 22–25, 28, 38–40, 42–44).

Дакументы публікуюцца на мове арыгіналу (беларуская і руская). Калі друкуюцца вытрымкі дакумента, у загалоўках да іх адзначаецца «З пратакола...», «З даведкі...» і г. д. Прапушчаны тэкст адзначаецца шматкроп’ем, якое заключаецца ў фігурныя дужкі {...}. Пры передачы адбіткаў пячатак і штампаў канец радка абазначаецца вертыкальнай рыскай |. Асаблівасці мовы аўтараў, іх стылю і арфаграфіі (напрыклад, напісанне «у» замест «ў») перадаюцца без змяненняў. Відавочныя памылкі выпраўлены без указання ў заўвагах. Скарачэнні раскрываюцца, а прапушчаныя літары прыўносяцца ў радок і заключаюцца

ў квадратныя дужкі. Неразборлівы тэкст передаецца шматкроп'ем і адзначаецца ў заўвагах.

Адбор дакументаў, падрыхтоўка іх да публікацыі ажыццёўлены: да першага раздзела – К. В. Сыцько, да другога раздзела – М. У. Глеб і Дз. А. Крэнт. Аўтар прадмовы – К. В. Сыцько.

## Літаратура


1. Gruša, A. Skorinos atminimo įprasminimas. Baltarusija / A. Gruša // Pranciškaus Skorinos «Rusėniškajai Biblijai» – 500 / sud. S. Narbutas. – Vilnius: Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, 2017. – P. 113–124.

2. Воранаў, Р. Паўстанне Скарыны. Як інтэлектуалы Расійскай імперыі XIX ст. паўплывалі на постаць беларускага нацыянальнага героя / Р. Воранаў // Палітычная сфера. – 2012. – № 18–19. – С. 156–181.

3. Voranau, R. The Belarusian Printing Pioneer Francišak Skaryna: The Early Modern Hero in Later National Interpretations / R. Voranau // Early Modern print culture in Central Europe. Proceedings of the young scholars section of the Wrocław Seminars, Sept. 2013 / ed.: S. Kiedroń, A.-M. Rimm in co-operation with P. Poniatowska. – Wrocław: Wyd. Uniw. Wrocławskiego, 2014. – S. 139–148.

# І. ПАДРЫХТОЎКА І ПРАВЯДЗЕННЕ СВЯТКАВАННЯ 400-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ

## 1

*З пратакола пасяджэння гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта*

*г. Мінск* *б/н ад 16.06.1924 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 49–49 адв. Машынапіс.

ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭНЬНЯ
Гісторыка-Археолегічнай Сэкцыі Інстытуту Беларускай Культуры
16 чэрвеня 1924 г.

Пасяджэньне адбылося пад старшынством В. Д. Друшчыца, сэкрэтарскія абавязкі выконвау І. М. Барашка.

В. Д. ДРУШЧЫЦ абвясьціу парадак дня: 1. Аб злучэнні этнографічнай сэкцыі з Гісторыка-Археолегічнай; 2. Даклады бібліаграфічныя; 3. Аб хрыстоматыі; 4. Аб навуковых экскурсыях; 5. Бягучыя справы.

(парадак дня прыймаецца).

{...}

2. ПІЧЭТА – В 1925 г. исполнится 400 лет со дня выхода в свет первой книги на белорусском языке (библии Ф. Скорыны). В Вильно и Ковна уже созданы комиссии по организации празднования юбилея. Но центром торжеств как научных, так и культурно-национальных должен стать Минск. Мы, Историко-археологическая Секция, вправе поднять эту проблему и преподнесть[1] её Институту Белорусской Культуры. Для организации празднования юбилея должна быть созвана Комиссия, которая кроме устройства торжественного заседания, должна будет устроить выставку старопечатных книг в государственной библиотеке и кроме этого имело ввиду издание научных работ о Францишке Скарине. У нас в Белоруссии таких работ еще нет. В план издания Комиссии должны войти: брошюрки в полтора – два листа печатных листа о Францишке Скарине, листовка на белорусском и еврейском языках; научный сборник посвященный Францишку Скарыне и его окружающей обстановке (Падуанский

[1] *Так у машынапісе.*

университет, его педагоги и др[угое]). В этом же сборнике необходимо поместить и снимки с первой библии, рисунки. Это выяснит историю рисунка и поставит вопрос о белорусских гравюрах; и популярная книга для домашнего чтения и учеников средних школ. Вот этим наша научная задача исчерпается и мы должны будем с сентября месяца приступить к реальным работам.

В. Д. ДРУШЧЫЦ – я мысьлю, што Інстытут Беларускай Культуры пойдзе наустрэчу, лічу патрэбным працу пачаць зараз жа. Выношу прапазыцыю каб гэтае пытаньне Прэзыдыум Сэкцыі паставіу на сходзе Інбелкульта.

КАСЬПЯРОВІЧ – неабходна выпрацаваць раней праэкт працы, намеціць вехі і тады увайсці у Інбелкульт.

ДРУШЧЫЦ – Лічыць неабходным прыняць прапазыцыю У. І. Пічэты і абгаварыць з Прэзыдыумом Інбелкульта. Выказваецца за неабходнасьць отпуску сродкау на гэтую патрэбу.

ПІЧЭТА – Уносіць рэзалюцыю па свайму дакладу «Гісторыка-археолегічная Сэкцыя Інбелкульту, заслухаушы даклад У. І. Пічэты адносна арганізацыі сьвяткаваньня юбілею з прычыны выхаду у сьвет першай кнігі на беларускай мове лічыць неабходным прасіць Інстытут Беларускай Культуры аб арганізацыі камісыі, у абавязкі якой, акрамя урачыстага пасяджэньня[1] і выстаукі павінна увайсьці выдавецкая праца, а іменна: брашура у паутара – два лісты, лістоука на беларускай і жыдоускай мове, навуковы зборнік аб Скарыне і популярная кніга для вучняу і мала падгатаваных чытачоу». (Рэзалюцыя прымаецца аднагалосна).

{...}

СТАРШЫНЯ ПАСЕДЖАННЯ — Друшчыц

ЗА[2] СЭКРЭТАР[3] — Тарашкевіч

---

[1] *Выпраўлена на* ўрачыстага пасяджэння, *было надрукавана* пасяджэння *і забіта паўторным друкам.*

[2] *Дапісана простым алоўкам.*

[3] *Так у машынапісе.*

## 2

*Пасведчанне на імя М. М. Шчакаціхіна аб камандзіроўцы ў г. Ленінград для навукова-даследчай працы ў Расійскай публічнай бібліятэцы і Бібліятэцы Расійскай акадэміі навук з мэтай даследавання гравюр у беларускіх старадруках*

*г. Мінск* *№ 73 ад 24.12.1924 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 41. Машынапіс.

### УДОСТОВЕРЕНИЕ[1]

Дано сие Члену Историко-Археологической Секции Института Белорусской Культуры, преподавателю по кафедре Истории Искусств Белорусского Государственного Университета, Николаю Николаевичу ЩЕКАТИХИНУ в том, что он командируется в гор[од] ЛЕНИНГРАД для научно-исследовательской работы в Российской Публичной Библиотеке и Библиотеке Российской Академии Наук по изучению гравюр в Белорусских (так назыв[аемых] Западно-Русских) старопечатных книгах, в особенности, в Пражских и Виленских изданиях Фр. Скарины 1517–1525 г.

Институт Белорусской Культуры обращается с просьбой ко всем научным учреждениям и отдельным лицам оказывать Н. Н. Щекатихину возможное содействие в его работе.

Вышеизложенное подписями и приложением печати удостоверяется.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ИНСТИТУТА
БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ Некрашевич

УЧЕНЫЙ СЕКРЕТАРЬ Дыла

[1] *На левым полі адбітак штампа Інбелкульта з запісам фіялетавым чарнілам* Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка | Народны камісарыят асветы | Інстытут Беларускае Культуры 24 XII | № 73 | Менск Рэвалюцыйная 21.

## 3

*З пратакола 2-га агульнага сходу членаў Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 2 ад 08.02.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 4–4 адв. Машынапіс.

ПРАТАКОЛ № 2[1]
2-га агульнага сходу членау Інстытуту Беларускае Культуры
ад 8 лютага 1925 г.

Сход адбыуся у залі пасяджэньняу Цэнтральнага Выканаучага Камітэту БССР.

На сходзе былі прысутнымі: Ігнатоускі У., Чарвякоу А., Адамовіч Я., Жылуновіч З., Баліцкі А., Каранеускі І., Усьпенскі А., Мароз М., Мазур І., Смоліч А., Дыла Я., Луцэвіч І., Міцкевіч К., Лёсік Я., Цьвікевіч І., Грамыка М., Гарэцкі М.[2], Друшчыц В., Азбукін М., Пятуховіч М., Плаунік С., Мялешка М., Пятровіч І., Барсукоу М., Замоцін І., Блюдуха М., Кірсанау А., Кацэнбоген С., Вальфсон С., Агурскі С., Ашаровіч І., Рывас С., Дамброускі Ч., Даведчык В., Родзевіч Ч., Фрышман В., Чарнушэвіч З., Пшэдзецкая С., Байкоу М., Кісьлякоу І., Красінскі М., Круталевіч А., Парэчын І., Рагавы П., Серада І., Сэрбау І., Чаржынскі У., Шчэкаціхін М.

Усяго – 49 членау.

I. Сэкратар Скарынінскае Камісіі – В. Друшчыц знаёміць з працаю гэтай камісіі, якая заложана была галоуным чынам для падрыхтоукі юбілейнага зборніка, прысьвечанага 400-х годзьдзю беларускага друку (на тэрыторыі Беларусі). Сучасны склад Скарынінскае Камісіі такі: праф[есар] У. Пічэта, М. Пятуховіч, М. Шчэкаціхін, Я. Лёсік, В. Друшчыц і Я. Дыла. Старшынёю зьяуляецца праф[есар] У. Пічэта, сэкратаром – В. Друшчыц.

Пасьля абмену думкамі сход выносіць пастанову:

1. Папоуніць склад Скарынінскае камісіі новымі членамі: Жылуновічам З. і праф[есарам] Кацэнбогенам.

2. Даручыць Камісіі у двутыдневы тэрмін распрацаваць плян сьвяткаваньня 400 беларускага друку, надаушы гэтаму сьвяту больш шырокі дзяржауны характар і вызначыушы тэрмін сьвяткаваньня. На наступным сходзе зрабіць належную справаздачу.

{...}

Старшыня І[нстытута]
Б[еларускай] К[ультуры] Ў[3]. Ігнатоўскі

Навуковы Сэкратар І[нстытута]
Б[еларускай] К[ультуры] Я. Дыла

---

[1] *Нумар дапісаны простым алоўкам.*

[2] Гарэцкі М. *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

[3] *Так у машынапісе.*

## 4

*З пратакола 1-га сходу гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 1 ад 24.02.[1925] г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 7. Машынапіс.

### ПРАТАКОЛ

### першага сходу Гістарычнай-Арехолегічнай[1] Сэкцыі Інбелкульту, адбыушагася 24/II.

Былі прысутнымі: Старшыня Сэкцыі – праф[есар] У. І. Пічэта, намесьнік старшыні – С. З. Кацэнбоген, сэкратар – В. Д. Друшчыц, сябры сэкцыі: Я. Дыла, М. Мялешка, І. Сэрбау, І. Шыпілла, М. Шчэкаціхін, Маркевіч, Мышко, Поляк І. П., Сапун А., Забела Т., Пашковіч М., Вахаеу М., Пінкевіч, А. Бурдзейка, П. Харламповіч, М. Філіповіч, А. Шлюбскі, І. Барашка і Дзямідовіч.

Павестка дня:

1. Організацыя працы Гістарычнай-Археолегічнай Сэкцыі.
2. Форма сьвяткаваньня 400-годзьдзя беларускага друку.
3. Бягучыя справы.

{...}

II. Пытаньне Формы сьвяткаваньня 400-годзьдзя друку на Беларусі.

Пастаноулена:

1. Дзень сьвяткаваньня адкласьці.
2. Дзень сьвята прызнаць сьвятам у рэспубліканскім масштабе. Прыняць крокі, каб сьвяткаваньне стала масавым сьвятам. У сьвяткаваньні павінны прыняць удзел усе школы рэспублікі і рабочыя клюбы.
3. Арганізаваць у дзень сьвята урачыстае пасяджэньне Інбелкульту з Унівэрсытэтам у Менску.
4. Урачыстае пасяджэньне у Полацку з адпаведнымі дакладамі.
5. Прыняць крокі каб у дзень сьвята уся прэсса удзяліла месца для артыкулау адносна сьвята.
6. Назваць імем Ф. Скарыны адну вуліцу у Полацку і адну школу.
7. Адліць Скарынінскі шрыфт і выдаць два партрэты Ф. Скарыны: адзін дараж[эй]шы, другі масавы.
8. Прыняць меры, каб сваячасна выйшлі з друку навуковы зборнік і популя[рная] брошура.

---

[1] *Так у машынапісе.*

9. Абраць лектароу для дакладау на урачыстых пасяджэньнях і у рабочых клюбах. Абраны наступныя асобы: У. І. Пічэта, М. Н. Піотуховіч, В. Друшчыц, Я. Дыла, Петкевіч, Забела, Бурдзейка, Каупак, Пашковіч, Маркевіч, Гіркант.

{...}

Старшыня Сэкцыі Пічэта

Сэкратар В. Дружчыц

## 5

*З пратакола Агульнага сходу членаў Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 4 ад 30.03.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 9–10. Машынапіс.

ПРАТАКОЛ № 4[1]
агульнага сходу членау Інстытуту Беларускае Культуры
ад 30/ІІІ-25 г.

Сход адбыуся ва уласным памяшканьні І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры].

На сходзе былі прысутнымі: Ігнатоускі У., Смоліч А., Родзевіч Ч., Міцкевіч К. (Якуб Колас), Азбукін М., Цьвікевіч І., Байкоу М., Піотуховіч М., Друшчыц В., Серада І., Усьпенскі Я., Мялешка М., Барсукоу М., Гольмшток Х., Пятровіч І., Лёсік Я., Рагавы П., Пауловіч А., Шчэкаціхін М., Каранеускі Я., Ажгірэй А., Гарэцкі М.[2], Тупяневіч С., Бядуля З., Аршанскі Б., Мазур І., Грабоускі І., Красінскі І., Сербау І., Даведчык В., Александроу Г., Бабарэка А., Ракау Я., Грамыка М., Шамаль Я. Сіманоускі Я.

Усяго 40 членау.

Парадак пытаньняу:

1. Даклад аб працы Прэзыдыуму.
2. – // – Жыдоускага Аддзелу.
3. – // – Скарынінскае Камісіі.
4. – // – Слоунікавае Камісіі.
5. Абраньне членау-супрацоунікау і карэспандэнтау.
6. Зацьверджаньне прэзыдыуму камісіі і складу Навуковае Рады.
7. Бягучыя справы.

Адчыніўшы сход, старшыня с[падар] Ігнатоускі прапанавау ушанаваць памяць загінуушых выдатных працаунікоу Компартыі і СССР т[аварышаў] Мясьнікова, Мархлеускага, Магілеускага і Атарбэкава.

---

[1] *Нумар дапісаны простым алоўкам.*

[2] Гарэцкі М. *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

Памяць памяненых ушаноуваецца уставаньнем.

Умяркоўваецца парадак пасяджэньня.

{...}

6. Аб дзейнасьці Скарынінскае Камісіі робіць справаздачу т[аварыш] Друшчыц.

Заслухаушы даклад сэкратара Скарынінскае Камісіі, агульны сход прызнау аднак, што плян сьвяткаваньня павінен быць календарна і дэтальна распрацаваны, што павінен быць высьветляны дакладна організацыйны бок гэтага сьвяткаваньня з зазначэньняу тых організацый, якія павінны прыняць удзел у гэтым, што павінна быць організавана выстаука белар[ускага] старога друку і скарынінскіх выданьняу, што сьвяткаваньне павінна прайсьці добра падрыхтаваным праз сваечаснае надрукаваньне скарынінскага зборніку, навукова-популярнага нарысу і іншых патрэбных к гэтаму часу выданьняу і г[этак] д[алей].

Сход прапанавау Каміссіі выдзеліць для гэтага адпаведную тройку і абавязау зрабіць на чарговым сходзе ад імя Камісіі належную грунтоуную справаздачу.

{...}

Сход зачыняецца а 10 гадзіне увечары.

Старшыня Ў. Ігнатоўскі

Навуковы Сэкратар І[нстытута]
Б[еларускай] К[ультуры] Яз. Дыла

**6**

*Ліст загадчыка Бібліятэкі Інбелкульта [І. Серады] у Мсціслаўскую цэнтральную бібліятэку з паведамленнем аб даце правядзення «Дня кнігі», аб падрыхтоўцы для высылкі кніг у рамках кнігаабмену і аб адсутнасці ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі кніг аб Усесаюзным дні кнігі*

*г. Мінск* *№ 1579 ад 02.09.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 70. Машынапіс.

У Мсціслаўскую Цэнтральную Бібліотэку.

У[1] адказ на адносьнік № 240 Бібліотэка Інстытуту Беларускае Культуры паведамляе, што «Дзень кнігі» на Беларусі адбудзецца 25 кастрычніка г[этага] г[оду] і будзе зьвязаны з урачыстым днём Францішка Скарыны, які выдаў першую кнігу на беларускай мове у 1525 г. Што тычыцца «Усесаюзнага дню кнігі», то аб ім нічога Вам пэўнага сказаць ня можам.

Адначасна Бібліотэка паведамляе, што ў абмен на ўзятыя ў Ц[энтральнай] М[сціслаўскай] Б[ібліятэ]цы кніжкі і згодна умовы, рыхтуецца да высылкі

[1] *Злева і зверху сінім алоўкам* спр. № 14.

ў Мсціслаўскую Цэнтральную Бібліотэку поўны камплект выданьняў Белдзяржвыдавецтва на беларускай мове.

Што ж тычыцца матар'ялу (кніг) аб Усесаюзным дню кнігі[1] – то ў магазынах Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі іх няма.

Загадчык Бібліотэкі І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры][2]

## 7

### *З пратакола пасяджэння Прэзідыума Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 32 ад 20.10.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 260–262. Машынапіс.

### ПРАТАКОЛ № 32[3]
### пасяджэньня Прэзыдыуму І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры], якое адбылося 20/X – 1925 г.

ПРЫСУТНЫМІ БЫЛІ: Нам[еснік] Старшыні І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] т[аварыш] Смоліч, Навуковы Сэкратар І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] ДЫЛА Я., Нам[еснік] Старшыні Поль[скага] аддзелу І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] т[аварыш] ВІТКОУСКІ, Нам[еснік] Ст[аршыні] Літ[аратурнай] сэкцыі т[аварыш] ПІОТУХОВІЧ, Старшыня Літ[аратурнай] каміссіі – т[аварыш] ЗАМОЦІН, Сэкратар Мовазнаўчае сэкцыі – ЧАРЖЫНСКІ, Сэкратар Літарат[аратурнай] Кам[ісіі] Яўрэйскага аддзелу – т[аварыш] ОЙСЛЕНДЭР.

Старшынстваваў – с[падар] Смоліч, Сэкратарстваваў – т[аварыш] Чарэпнін.

| Слухалі | Пастанавілі. |
| --- | --- |
| {...} | |
| Па дакладу Нав[уковага] Сэкратара І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] т[аварыша] Дылы аб набыцьці для Інбелкульту партрэту[4] Ф. Скарыны работы мастака Кругэра па прапанове апошняга. | Пытаньне з набыцьцём партрэту Ф. Скарыны адлажыць да высьвятленьня каштарысу па юбілею Скарыны. |

{...}

Старшыня А. Смоліч

Сэкратар Чарэпнін

[1] *Над радком чорным чарнілам* а таксама па пытанннях аб «шкодніках б. будоўлі».

[2] *Подпіс адсутнічае.*

[3] *Выпраўлена цёмна-сінім чарнілам, было надрукавана* 30.

[4] *Выпраўлена цёмна-сінім чарнілам, было надрукавана* партрэты.

## 8

*З пратакола пасяджэння Прэзідыума Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 40 ад 17.12.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 298–299. Машынапіс.

ПРАТАКОЛ № 40
пасяджэньня Прэзыдыуму Інстытуту Беларускае Культуры,
якое адбылося 17 сьнежня 1925 году

ПРЫСУТНЫМІ БЫЛІ: Старшыня І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] т[аварыш] ІГНАТОЎСКІ, Нам[еснік] Старшыні т[аварыш] Смоліч і члены Прэзыдыуму: Жылуновіч, Дыла, Віткоўскі і Аршанскі.

Старшынстваваў т[аварыш] Ігнатоўскі. Сэкратарстваваў т[аварыш] Чарэпнін.

| Слухалі: | Пастанавілі: |
|---|---|
| I. Аб павесцы дню наступнага пасяджэньня Навуковай Рады І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры]. | I. Пастанавілі вызначыць наступны парадак дню пасяджэньня Навуковай Рады:<br>{...}<br>3. Даклад Скарынінскай Каміссіі аб сьвяткаванні юбілею 400 годзьдзя беларускага друку. |
| {...} | |
| XVII. Аб звароце І[нстытуту] Б[еларускай] К[ультуры] выдаткаў, зробленных І[нстытутам] Б[еларускай] К[ультуры] на выданьне Скарынінскага навуковага зборніку[*].<br>(Даклад т[аварыша] Дылы). | XVII. У зьвязку з зваротам Юбілейнай Скарынінскай Камісіяй выдаткаў І[нстытут] Б[еларускай] К[ультуры] на Скарынінскі зборнік, і у зьвязку з патрэбай аплаціць рамонтныя і па абсталяваньню І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] выдаткі, лічыць патрэбным атрыманую суму (2754 руб[лей] 40 кап[еек]) прызначыць на гэтую патрэбу. |
| XVIII. Аб набыцьці партрэту Ф. Скарыны ў зьвязку з 400 годзьдзем беларускага друку.<br>(Даклад т[аварыша] Дылы). | XVIII. Набыць партрэт Ф. Скарыны, напісаны мастаком Кругерам за 200 рублёў у поўную І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] уласнасьць. |

Старшыня[1] А. Смоліч

Сэкратар Чарэпнін

[*] *Гаворка ідзе аб зборніку «Чатырохсотлецце беларускага друку 1525–1925» (Мінск: Інбелкульт, 1926), які выйшаў у 1927 г.*

[1] *Далей сінім чарнілам касая рыса, якая абазначае, што за старшыню У. Ігнатоўскага распісаўся А. Смоліч.*

## 9

*З пратакола пасяджэння Навуковай рады Інбелкульта*

*г. Мінск* *№ 4 ад 23.12.1925 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 28–28 адв. Машынапіс.

### ПРАТАКОЛ № 4
### пасяджэньня Навуковае Рады Інстытуту Беларускае Культуры, якое адбылося 23-га сьнежня 1925 году

ПРЫСУТНЫМІ БЫЛІ: т[аварышы] Ў[1]. Ігнатоўскі, Трэмповіч, Каранеўскі, Дыла, Сербаў, Ойслэндэр, Чаржынскі, Грамыка, Цьвікевіч, Гарэцкі, Віткоўскі, Смоліч, Гартны, Пятровіч, Гайвароўскі, Колас, Гельтман, Друшчыц.

Старшынстваваў ІГНАТОЎСКІ. Сэкратарстваваў ЧАРЭПНІН.

| Слухалі: | Пастанавілі: |
| --- | --- |
| {...} | {...} |
| II. Даклад т[аварыша] Друшчыца аб сьвяткаваньні юбілею 400 годзьдзя беларускага друку, пры гэтым ім быў зачытан плян сьвяткаваньня апрацованы і прыняты Цэнтральнай Юбілейнай камісіяй. (Гл[ядзі] плян апублікованы ў газэце) | II. Ня гледзячы на тое, што падгатоўка да сьвяткаваньня як належна[2] незакончана – 1. Сьвяткаваць у вызначаны тэрмін 29 і 30 сьнежня г[этага] г[оду]. 2. Прапанаваць Юбілейнай камісіі ўвайсьці ў больш цесную сувязь з рэдакцыямі газэт, каб яны тэрмінова зьмесьцілі у газэтах як мага болей матэр’ялу, артыкулаў, а таксама тэзісы да правядзеньня сьвяткаваньня. 3. Прасіць Дзяржвыдат як найхутчэй выдрукаваць брашуру аб Скарыне ужо здадзеную у выдавецтва. 4. Паслаць прадстаўнікоў на ўрачыстасьці у[3] Полацак у складзе т[аварышаў] Віткоўскага, М. Грамыкі і М. Шчэкаціхіна. |

{...}

Старшыня[4] А. Смоліч

Сэкратар Чарэпнін

[1] *Так у машынапісе.*

[2] *Выпраўлена сінім чарнілам, было надрукавана* як сьлед.

[3] *Так у машынапісе.*

[4] *Далей чорным чарнілам касая рыса, якая абазначае, што ў пратаколе за старшыню распісаўся не У. Ігнатоўскі, як гэта запісана ў прэамбуле пратакола, а А. Смоліч.*

## 10

*Запрашэнне рэдкалегіі «Скарынінскага зборніка» У. І. Пічэце, В. Д. Дружчыцу і М. М. Шчакаціхіну да ўдзелу ў пасяджэнні рэдкалегіі «Скарынінскага зборніка»*

*г. Мінск* *№ 421 ад 12.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 18. Машынапіс.

Членам Скарынінскае Камісіі

Проф[есарам] Уладзіміру Пічэце
Васілю Друшчыцу
Міколе Шчэкаціхіну

У[1] суботу, 13 лютага б[ягучага] г[оду] а 2 гадз[іне] ўдзень адбудзецца пасяджэньне Рэдакцыйнае Колегіі, на якім будуць разглядацца пытаньні, зьвязаныя з выданьнем Скарынінскага зборніку.

Дзеля гэтага Колегія просіць Вас быць прысутным на гэтым пасяджэньні.

Сэкратар Колегіі М. Круталевіч 13/II 926



Мал. 1. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 18. Машынапіс. 12.02.1926 г. – Запрашэнне рэдкалегіі «Скарынінскага зборніка» У. І. Пічэце, В. Д. Дружчыцу і М. М. Шчакаціхіну да ўдзелу ў пасяджэнні рэдкалегіі «Скарынінскага зборніка»

[1] *Злева на полі чырвоным алоўкам* 30а.

## 11

*Ліст выдавецкага аддзела Інбелкульта да У. І. Пічэты з просьбай аб дапрацоўцы артыкула «Беларуска-ўкраінскае адраджэнне», а таксама аб перадачы ў сакратарыят рэдкалегіі Інбелкульта прадмовы да «[Скарынінскага] зборніка» і двух артыкулаў для яго*

*г. Мінск* *№ 502 ад 20.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 28. Машынапіс.

Члену Інбелкульту – Проф[есару] Пічэце.

Паводле[1] пастановы Рэдакцыйнае Колегіі Інбелкульту ад 13/II б[ягучага] г[ода] (Прот[окол][2] № 5, п[ункт] 9) Выдавецкі Аддзел просіць

1. Не адмовіць зрабіць перагляд свайго артыкулу «Беларуска-Украінскае Адраджэньне» з тэю мэтаю, каб па магчымасьці сконцэнтраваць увагу пераважна на беларускім адраджэньні і

2. Перадаць у Сакратарыят Колегіі магчыма хутчэй свае артыкулы:

а. Прадмову да Зборніку,

б. Агляд друку,

в. Скарыніяду.

Старшыня Рэдакцыйнае Колегіі[3]

Сакратар – Член Інбелкульту[4]

## 12

*Ліст [выдавецкага аддзела] Інбелкульта да Б. І. Эпімах-Шыпілы з просьбай аб рэдагаванні замежных імёнаў і слоў у «Скарынінскім зборніку»*

*г. Мінск* *№ 517 ад 22.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 30. Машынапіс.

Члену І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] – т[аварышу] Эпімаху-Шыпіле.

Згодна[5] пастановы Рэдакцыйнае Колегіі Інбелкульту ад 13/II б[ягучага] г[ода] (прот[окол][6] № 5, п[ункт] 9) просіць Вас узяць на сябе радагаваньне замежных імёнаў і слоў у Скарынінскім зборніку.

Старшыня Рэд[акцыйнай] Колегіі[7]

Сакратар[8]

---

[1] *Злева на полі сінім алоўкам* спр. № 30а.

[2] *Так у машынапісе:* Прот.

[3] *Подпіс адсутнічае.*

[4] *Подпіс адсутнічае.*

[5] *Злева і зверху сінім алоўкам* спр. № 30а.

[6] *Так у машынапісе:* Прот.

[7] *Подпіс адсутнічае.*

[8] *Подпіс адсутнічае.*

## 13

*Запрашэнне выдавецкага аддзела Інбелкульта В. Д. Дружчыцу, І. Б. Сіманоўскаму і Ю. І. Бібіле наведаць сакратарыят рэдкалегіі Інбелкульта для абмеркавання пытанняў аб ілюстраванні «Скарынінскага зборніка»*

*г. Мінск* *№ 484 ад 02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 29. Машынапіс.

Друшчыцу, Сіманоўскаму, Бібіле[1]
Члену Інбелкульту[2]

Выдавецкі[3] аддзел І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры] просіць Вас зайсьці ў суботу (20/II) а I гадзіне ўдзень у Сакратарыят Рэд[акцыйнай] Колегіі для перагавораў па пытаньні аб ілюстраваньні Скарынінскага Зборніку.

Сакратар Выд[авецкага] Аддз[ела] (Красінскі)[4]

## 14

*Ліст выдавецкага аддзела Інбелкульта да М. В. Доўнар-Запольскага з просьбай аб рэдагаванні чатырох артыкулаў для «Скарынінскага зборніка», а таксама аб дасланні для публікацыі ў гэтым зборніку ўласнага артыкула*

*г. Мінск* *№ 520 ад 22.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 46. Машынапіс.

Праф[есару] ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАМУ

Згодна[5] пастановы Рэдакцыйнае Колегіі Інбелкульту ад 13 лютага (пратакол № 5, п[ункт] 9) Выдавецкі Аддзел просіць Вас не адмовіць зрабіць перагляд з навуковага боку ніжэйпаданых артыкулаў:

а. Літоўска-Беларуская дзяржава

б. Полацкая зямля

в. Места Вільня ў XVI ст.

---

[1] *Прозвішчы дапісаны чырвоным чарнілам.*

[2] *Так у машыпапісе* (Члену Інбелкульту *надрукавана пасля ўказання прозвішчаў*).

[3] *Злева і зверху сінім алоўкам* спр. № 30а.

[4] *Чырвоным чарнілам.*

[5] *Злева і зверху сінім алоўкам* спр. № 30а.

г. Францішак Скарына і яго жыццё,

а таксама даць свой артыкул, матар'ял якога быў бы вычэрпваючым дадаткам да зборніку.

Пералічаныя артыкулы прыкладаюцца.

Старшыня Рэдакцыйнае Колегіі[1]

Сакратар[2]

## 15

*Ліст рэдкалегіі Інбелкульта выкладчыку Віцебскага мастацкага тэхнікума, мастаку [М. Г.] Эндэ з просьбай неадкладна даслаць афармленне для «Скарынінскага зборніка»*

*г. Мінск* *№ 514 ад 22.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 47. Машынапіс.

Віцебск
Мастацкі Тэхнікум
Эндэ

Палова[3] артыкулаў Скарынінскага Зборніку канчальна гатова да друку, здача ў набор затрымліваецца тым, што не атрымалі зробленых Вамі аздоб.

Высылайце безадкладна ўсё, што ўжо гатова; рэшту рабеце як мага хутчэй.

Безадкладна зрабеце ў першую чаргу дзьве пачатковыя літары: «П» і «Д».

Старшыня Рэдакцыйнае Колегіі[4]

Сакратар – Член Інбелкульту[5]

---

[1] *Подпіс адсутнічае.*
[2] *Подпіс адсутнічае.*
[3] *Злева сінім алоўкам* спр. № 30а.
[4] *Подпіс адсутнічае.*
[5] *Подпіс адсутнічае.*

## 16

*Справаздача Выдавецкага Аддзела Інбелкульта за 12.02.1926 – 26.02.1926 аб падрыхтоўцы «Скарынінскага зборніка»*

*г. Мінск* *б/н 25.02.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 151. Рукапіс.

Справаздача
Выдавецкага Аддзелу І[нстытута] Б[еларускай] К[ультуры]
за час з 12/II па 26/II 26 г.[1]

| рукапісы | Прагле-дж[ана] грама-т[ычна] | Прагле-дж[ана] стыліс-т[ычна] | Здано ў друк | Корэк-тура | Аўтарск[ая] корэкт[ура] | Адказн[ая] корэкт[ура] | Зьверкі | Колькі выйшла з друку | Увагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Скар[ынінскі] зборн[ік] | – | 2 | 3 | – | – | – | – | – | |
| усяго | | 2 | 3 | | | | | | |

Адбылася нарада па пытанні аб ілюстраваньні «Скар[ынінскага] збор[ніка]».

Зроблена стыл[істычная] рэдакцыя арт[ыкула] «Гуманізм у Італіі» ў адносінах да ўласных імёнаў з Эпімах-Шыпілам і Лёсікам.

Адбылося пасяджэньне Рэдакцыйнае Колегіі.

Складзены і выкананы протокол[2] ад 13 лютага б[ягучага] г[ода].

Пасланы напамінкі аб прысылцы рукапісаў паводле выд[авецкага] пляну.

25/II 26 Сакратар – Член І[нстытута]
Б[еларускай] К[ультуры] М. Красінскі

[1] За час з 12/II па 26/II 26 г. *дапісана чырвоным чарнілам.*
[2] *Так у машынапісе.*

## 17

*З даведкі выдавецтва Інбелкульта аб стане гатоўнасці «Скарынінскага зборніка»*

*г. Мінск* *б/н 24.03.1926 г.*

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 177–178. Рукапіс.

### Спраўка
### Выдавецтва Інбелкульту на 25 сакавіка 1926 году

I. Скарынінскі Зборнік[1]

Есьць у Сакратарыяце[2]: усё, апроч двох артыкулаў Пічэты: а) «Агляд друкарства», б) «Скарыніяда» (атрымаем у пачатку красавіка)[*].

Зроблена рэдакцыя[3]: а) Навуковая[4]: усіх артыкулаў, апроч артыкулу Любаўскага (будзе зроблена на гэтым тыдні). б) Стылістычная[5]: 4 артыкулы (з іх – першы артыкул – 3 аркушы – зданы ў Б[еларускае] Д[зяржаўнае] В[ыдавецтва] 22/II (заказ № 4), рэшта адрэдагаваных артыклаў будзе здана ў Б[еларускае] Д[зяржаўнае] В[ыдавецтва] 27/ III).

У Б[еларускім] Д[зяржаўным] В[ыдавецтве][6]: Артыкул «Гуманізм у Італіі» – 22/II[7], заказ № 4. Набор не пачынаўся дзеля таго, што акадэмічныя шрыфты былі заняты, даны загад набіраць лацінскім корпусам.

Аздобы да зборніку[8]: Есьць усе і клішы[9] зроблены.

Вокладка[10] – заказана мастаку, атрымаем да 10 мая б[ягучага] [года].

---

[1] Скарынінскі зборнік *падкрэслена сінім чарнілам.*

[2] Есьць у Сакратарыяце *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

[*] *Паводле пазнейшай даведкі, напісанай не пазней за 19 мая 1926 г., аб стане ўсіх здадзеных у друк зборнікаў Інбелкульта, зборнік, прысвечаны 400-годдзю беларускага друку, быў перададзены Скарынінскай камісіяй у Інбелкульт. Аднак ён патрабаваў дапрацоўкі, з-за чаго яго выданне адкладвалася. Як вынікае са зместу згаданага дакумента, галоўным ...тормазам у працы выдавецтва ёсьць няхват падрыхтаваных аўтарамі рукапісаў... Члены Інбелкульту... свае нават ужо напісаныя працы не спяшаюцца падрыхтаваць да друку... (гл. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп 1. Спр. 17. Арк 185). Першую карэктуру некаторых артыкулаў у Інбелкульце атрымалі толькі ў маі 1926 г., як, напрыклад, карэктура артыкула Дз. Ягорава «Падуанскі універсытэт у XV – XVI сталецьцях», якая паступіла 06.05.1926 г. (там жа. Арк. 186).*

[3] Зроблена рэдакцыя *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

[4] Навуковая *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

[5] Стылістычная *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

[6] У Б. Д. В. *падкрэслена чырвоным алоўкам.*

